Марыя ЛЯШУК



# БОГ СТВАРЫЎ ЗЯМЛЮ ДЛЯ ДАБРЫНІ

*Абразкі*

## ТРАПЯТКОЙ ПАМЯЦІ БЛІКІ

Ах, якім жа ярка-блакітным і высокім было тое лютаўскае неба! А свежы снег смарагдава іскрыўся ў промнях сонейка, што ўзнімалася ўсё вышэй. Дзень па-сапраўднаму зімовы, аднак у паветры ледзь улоўна ўжо пахне вясной. Толькі да яе прыходу неабходна абавязкова завяршыць зімовыя работы.

І двое актыўна арудуюць ручной пілой, каб да абеду скончыць распілоўку вялікай кучы бярозавых бярвенняў. Двое – гэта я і мой дзядзька, стрыечны брат бацькі: маці аднаго і бацька другога – родныя брат і сястра. У дзядзькі сваёй сям'і няма. Каханне ўсяго яго жыцця і калега выбрала іншага і была шчаслівая з ім. Лепшую за яе дзядзька не знайшоў і да канца жыцця быў верны чыстаму і светламу пачуццю, на вяршыні якога недасягальнай зорачкай ззяла тая, адзіная, але чужая. А дзядзька жыў разам са сваёй маці і яе незамужняй сястрой, якія з гадамі змірыліся з адзінокім лёсам сына і пляменніка.

Пасля смерці галавы сямейства мой дзядзька стаў іх адзінай апорай. Усе гаспадарчыя пытанні леглі на яго плечы. На ўсё катастрафічна не хапала часу ў сельскага настаўніка. Таму даводзілася звяртацца да іншых: за плату з задавальненнем выконвалі тую ці іншую працу аднавяскоўцы, часам дапамагаў стрыечны брат па матчынай лініі, які жыў з сям'ёй непадалёк.

А ў той лютаўскі суботні дзень прапанавала сваю дапамогу і я. Вырасла ў суседняй вёсцы, мне тады была, зрэшты, як і цяпер, не чужая любая работа

і кнігамі, канапа і некалькі крэслаў – вось і ўсё ўбранне памяшкання. Вельмі сціпла нават для вёскі. Але яго гэта задавальняе. Тут захоўваюцца дарагія яго сэрцу экзэмпляры кніг з дарчымі надпісамі аўтараў. Кніг шмат. І сярод іх зборнікі паэзіі любімай вучаніцы – Жэні Янішчыц. Тым разам менавіта іх Фёдар Фёдаравіч і паказваў мне. А яшчэ яе лісты – нешматлікія, караценькія, але такія шчырыя…

Калі яго не стала, зніклі ўсе гэтыя бясцэнныя дакументы. Хутчэй за ўсё, іх кінулі ў агонь, як макулатуру, новыя гаспадары сціплай хаткі сельскага настаўніка, сваякі па матчынай лініі. Наўрад ці яны здаліся цікавымі людзям, вельмі далёкім ад літаратуры.

Прыходзіць у запусценне падворак, дзе нарадзіўся, жыў і завяршыў зямны шлях гэты неардынарны педагог. Зрэшты, як і яго апошні прытулак, які па магчымасці наведваю і прыводжу ў парадак. Часцей вяртаю ў памяці дарагія сэрцу эпізоды нашых сустрэч. … Ах, якім жа ярка-блакітным і высокім было тое лютаўскае неба!

## МОЙ АНЁЛ-АХОЎНІК

Зімы ў той далёкі час былі марознымі і снежнымі. Мінула ўжо амаль паўстагоддзя, а адна з іх да гэтага часу ўсплывае ў памяці ярка і выразна. Нават не сама зіма, а адзін з яе дзён – напярэдадні Новага года.

Пасля заканчэння ВНУ прыехала ў родны горад на працу. На тым прадпрыемстве, дзе я працавала па сваёй спецыяльнасці, вялікім і багатым, была добрая самадзейнасць. І для харыстаў, у шэрагі якіх я ўлілася адразу, пашылі

як ніколі шмат. І не дзіўна – Новы Год наперадзе. Словам, аўтобус не змог змясціць усіх, многія засталіся на вакзале. Выратаваннем у гэтай сітуацыі аказалася таксі. Заплаціўшы ў некалькі разоў больш, чым звычайна, чатыры пасажыркі, сярод якіх была і я, дабраліся ў роднае паселішча нават раней за аўтобус.

Вуліцы ў вёсцы, вядома ж, чысціліся, а сцяжынкі да іх ад сваіх дамоў гаспадары пракладвалі самі. І мая матуля таксама. Але ў той дзень гэты занятак быў марным: снег зноў засыпаў іх праз кароткі час. Калі я дабралася ў вёску, ужо апусціліся прыцемкі. У хатах гарэлі агні. Прызыўна свяціліся ўдалечыні і вокны мамінага дома, які знаходзіўся наводшыбе. Каб трапіць да яго, трэба было прайсці самай блізкай вуліцай, а затым завярнуць у завулак. Праўда, улетку гэты шлях можна было скараціць удвая, прайшоўшы напрасткі па полі. Цяпер яно было белым ад снегу. Рызыкаваць – сабе даражэй.

І ўсё ж такі чамусьці я рызыкнула, аб чым неўзабаве пашкадавала. Цяжкія сумкі з прадуктамі і ўборам Снягуркі сталі непад'ёмнымі, але пакінуць іх нельга было ні ў якім разе. Ногі вязлі ў глыбокім снезе, які, трапляючы ў боцікі, студзіў іх. Кожны крок даваўся ўсё цяжэй. Адлегласць да маміных вокнаў амаль не скарачалася. Сілы на зыходзе, хацелася спыніцца, прылегчы на мяккай, але такой халоднай снежнай пярыне. Праўда, я выдатна ўсведамляла, чым усё можа скончыцца і што было моцы закрычала:

– Мама! Дапамажы, мамачка, выратуй мяне!

Перамагаючы раптоўную слабасць, працягвала ісці наперад. Калі заўва-

Усявышняга прыйшло мне выратаванне. І анёлам-выратавальнікам і захавальнікам для мяне ў Яго руках была мая матуля.

## НА ГРАНІ ВАР'ЯЦТВА

Шлях наш меўся быць няблізкі – шэсць гадзін машынай толькі ў адзін бок. На пагранічную заставу на ўкраінскай мяжы. За акном спачатку мільгалі гарадскія краявіды. Іх змянялі дагледжаныя сельскія паселішчы. Паміж імі да самага гарызонту – зялёныя лугі, жаўтлявыя палі жыта, пшаніцы і іншых збожжавых. А над усім гэтым – высокае сіняе неба. Натуральная прыгажосць прыроды ў разгар лета хвалявала сэрца, радавала.

Затым пайшлі пералескі, і дарога неўзаметку паглыбілася ў лес. Перад вачыма замільгалі высокія карабельныя хвоі ўперамешку з велічэзнымі елкамі. Дзівілі сваёй веліччу магутныя векавыя дубы.

Нарэшце дрэвы сталі радзейшыя, і мы выехалі на адкрытую прастору. Ад убачанага пахаладзела ў грудзях. Карціна была гнятлівай і нават жахлівай: над густымі зялёнымі параснікамі кустоўя ўзвышаліся ствалы дрэў без верхавін і лісця. Шмат бярозавых ствалоў, ды і іншых дрэў таксама. Яны цягнуліся ўздоўж дарогі некалькі кіламетраў. Адразу ўспомніліся даўнія чуткі аб нейкіх сакрэтных выпрабаваннях новай зброі ў гэтых мясцінах і адсяленні людзей. Толькі тыя чуткі, не пацверджаныя фактамі, неўзабаве сціхлі. На змену адной версіі ў галаву прыходзіць іншая. Навокал балота, таямнічае і непрадказальнае, яно дае жыццё

водзілася звяртацца да іншых: за плату з задавальненнем выконвалі тую ці іншую працу аднавяскоўцы, часам дапамагаў стрыечны брат па матчынай лініі, які жыў з сям'ёй непадалёк.

А ў той лютаўскі суботні дзень прапанавала сваю дапамогу і я. Вырасла ў суседняй вёсцы, мне тады была, зрэшты, як і цяпер, не чужая любая работа па гаспадарцы. З дзядзькам Фёдарам у мяне склаліся даверлівыя адносіны.

Фёдару Фёдаравічу Цудзілу цікава абсалютна ўсё, што тычыцца маёй вучобы ў ВНУ, жыцця ў сталіцы, маіх літаратурных спроб. Асаблівая цікавасць да маёй сустрэчы з яго любімай вучаніцай, якая стала да таго часу ўжо даволі вядомай у краіне і за яе межамі таленавітай паэтэсай, – Яўгеніяй Янішчыц. Ён просіць не прапусціць ніводнай дробязі з размовы з ёй. І карэктна падказвае, на што звярнуць увагу пры чарговых зносінах з Жэняй.

З адной тэмы плаўна пераходзім на іншую і не заўважаем, што праца наша завяршаецца, а бабулі Зіна і Насця ўжо клічуць на абед. З гэтай просценькай вясковай хаткі нікога не выпусцяць без пачастунку, а ўжо памагатую – тым больш. «Матухна і цётачка гатуюць на абед ці дзве першыя, ці дзве другія стравы», – з гумарам і цеплынёй у голасе заўважаў Фёдар Фёдаравіч.

Ежа ў гаспадынь заўсёды атрымлівалася сытнай і гатавалася па старажытных рэцэптах. Шкада, па маладосці прапусціла магчымасць скрупулёзна распытаць і запісаць складнікі гэтых рэцэптаў. І вось мы сядзім за невялікім абедзенным столікам, застаўленым місачкамі і талеркамі. Сядзім удваіх, а бабулі прымасціліся на ўслончыку каля галандскай печкі, звыкла прыціснуўшы спіну да яе жыватворнай цеплыні. І назіраюць, ці ўсё з'едзена, – а як жа інакш, яны ж так стараліся.

Абед нарэшце скончаны, і Фёдар Фёдаравіч запрашае мяне ў свой «кабінет» – невялікі пакой, што служыць яму і спальняй, і залай. Шафы з адзеннем ўсплывае ў памяці ярка і выразна. Нават не сама зіма, а адзін з яе дзён – напярэдадні Новага года.

Пасля заканчэння ВНУ прыехала ў родны горад на працу. На тым прадпрыемстве, дзе я працавала па сваёй спецыяльнасці, вялікім і багатым, была добрая самадзейнасць. І для харыстаў, у шэрагі якіх я ўлілася адразу, пашылі шыкоўныя канцэртныя ўборы: белыя сукенкі з залатым аздабленнем і высокія кароны, абсыпаныя рознакаляровымі каменьчыкамі. Убор выглядаў багата і прыгожа.


Фота з архіва БелТА

У маёй роднай вёсцы на навагодніх святах заўсёды было весела і шматлюдна. Планавалася незвычайная праграма і тым разам. Ды вось няўдача: прыхварэла дзяўчына, якая іграе Снягурку. І мая сяброўка, загадчыца сельскага клуба, папрасіла яе замяніць. Даўшы згоду, я стала думаць аб уборы казачнай гераіні. У выніку спынілася на харавым, тым больш, што кіраўнік нашага песеннага калектыву дазволіў яго ўзяць.

У перадапошні дзень старога года, пятніцу, мяло з самай раніцы. Да вечара стыхія ўзмацнілася, а ахвочых дабрацца ў вёску апошнім рэйсам было дзе, хацелася спыніцца, прылегчы на мяккай, але такой халоднай снежнай пярыне. Праўда, я выдатна ўсведамляла, чым усё можа скончыцца і што было моцы закрычала:

– Мама! Дапамажы, мамачка, выратуй мяне!

Перамагаючы раптоўную слабасць, працягвала ісці наперад. Калі заўважыла маленькую чорную кропку, якая рухаецца насустрач, вырашыла, што прымроілася. На ўсякі выпадак, сабраўшы апошнія сілы, зноў стала клікаць маці. І яна, мая матуля, хутка з'явілася з цемры. Абапіраючыся на высокі кій, яна падтрымлівала мяне і вяла туды, дзе было цёпла і ўтульна.

Усведамленне таго, што магло са мной здарыцца ў полі, прыйшло тады, калі матуля адпойвала мяне гарачай гарбатай, накрыўшы пуховай коўдрай. І расказвала, як незразумелая трывога раптам падступіла да сэрца, прымусіла некалькі разоў выйсці на вуліцу і ўглядацца ў снежную заслону. Так яна і пачула мой кліч аб дапамозе і адчайна кінулася ў непагадзь.

Гэта было самае шчаслівае ў маім жыцці навагодняе свята. Па волі цягнуліся ўздоўж дарогі некалькі кіламетраў. Адразу ўспомніліся даўнія чуткі аб нейкіх сакрэтных выпрабаваннях новай зброі ў гэтых мясцінах і адсяленні людзей. Толькі тыя чуткі, не пацверджаныя фактамі, неўзабаве сціхлі. На змену адной версіі ў галаву прыходзіць іншая. Навокал балота, таямнічае і непрадказальнае, яно дае жыццё і забірае яго. Балотная вада страшэнна чарнее ў глыбокіх канавах уздоўж пясчана-жвіровай дарогі.

Урэшце мы дабіраемся да пункта прызначэння. Сучасныя будынкі, найноўшая ваенная тэхніка, якая прафесійна абслугоўваецца байцамі. Даверлівыя гутаркі з імі на самыя розныя тэмы. Спакойныя і выверанія дзеянні маладых салдат.

Ніякага напружання і нервовасці. Без пафасу кажуць яны аб адказнасці, ускладзенай на іх Радзімай – свята берагчы яе рубяжы. Берагчы мір, такі далікатны і такі хісткі сёння. Але як жа ўтульна і шчасліва ў ім жыць і працаваць!

Наша знаходжанне на граніцы заканчваецца. Збіраемся ў зваротную дарогу. Вакол – разамлелая ад спякоты цішыня. Толькі верхавіны стройных соснаў ледзь варушацца пад лёгкім подыхам ветру. Ды палотнішча сцяга крыху хвалюецца ад яго дотыку. Праз кіламетр ад беларускай заставы – украінская. Там – небяспека. Там – непрадказальнасць. Неадэкватныя асобы ва ўладзе і іх заакіянскія падбухторшчыкі вядуць вялікую краіну-суседку да вялікай бяды, адкрыта заяўляюць аб прымяненні ядзернай зброі, не задумваючыся пра наступствы. Пякельная моц атама спапяліць усё жывое дашчэнту. І бярозкі без верхавін у балоце могуць здацца на гэтым фоне жыццесцвярджальнымі. Бог стварыў зямлю для дабрыні, а не для таго, каб чалавек яе знішчыў. Ён яшчэ дае чалавецтву права выбару і церпіць яго шалёныя выхадкі. Пакуль трывае.